## У Міншчыны ёсць кіраўнік

**На XXVII сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць сёмага склікання разглядалася толькі адно пытанне — кандыдатура кіраўніка Мінскага аблвыканкама. Аднагалосным рашэннем дэпутатаў гэтую пасаду заняў Анатоль Ісачанка, які раней працаваў памочнікам Прэзідэнта Беларусі — інспектарам па Мінскай вобласці.**

— На ўсіх этапах працоўнай дзейнасці Анатоль Ісачанка адказна ставіўся да сваіх абавязкаў, праяўляў ініцыятыву, дэталёва вывучаў кадравы патэнцыял таго ці іншага рэгіёна. Прыйшоўшы працаваць у Мінскую вобласць, ён аператыўна паглыбіўся ва ўсе праблемы, — адзначыла **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА,** прадстаўляючы кандыдатуру магчымага старшыні.

Па яе словах, Анатоль Ісачанка прайшоў усе прафесійныя ступені — ад інжынера да кіраўніка. «Таму ён ведае, што адбываецца на зямлі, — дадала Наталля Качанава. — І я ўпэўнена, што з абраннем Анатоля Ісачанкі Мінская вобласць атрымае новы этап у станаўленні і развіцці».

Пасля абрання **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль ІСАЧАНКА** падзякаваў за аказаны давер, падтрымку яго кандыдатуры, пасля чаго расказаў аб праблемах вобласці. Сёння перад новаабраным кіраўніком стаяць такія задачы, як актывізацыя інвестыцыйнай дзейнасці, праца з кадрамі, развіццё інфраструктуры і выхад на рэнтабельную работу прадпрыемстваў.

— Кожны кіраўнік на пэўным этапе павінен вырашаць тыя праблемы, якія сёння надзённыя. А ў цэлым, пра што б ні казалі, усе паказчыкі накіраваныя толькі на адно — каб нам жылося лепш. Тое, што датычыцца эканомікі, прыбытковасці, кадравага патэнцыялу, — гэта ўсё складнікі аднаго — дабрабыту нашага народа, — дадаў Анатоль Ісачанка.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *margo@zviazda.by*

## Калі нарадзіўся 3 ліпеня

**У кожным рэгіёне маладыя мамы, чые дзеці з'явіліся на свет у Дзень Незалежнасці, атрымалі падарункі ад членаў урада, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, кіраўнікоў адміністрацый раёнаў, кіраўніцтва арганізацыйных структур «Белай Русі».**

У краіне ўчора прайшла акцыя «Белая Русь» — з любоўю да дзяцей», якая па традыцыі прымеркавана да Дня Незалежнасці. З 2009 года больш за 2,5 тысячы матуль ужо атрымалі віншаванні з падарункамі. У сталіцы акцыя праходзіла сёлета ў РНПЦ «Маці і дзіця», 1-й, 3-й, 5-й і 6-й гарадскіх клінічных бальніцах, радзільным доме №2 і Мінскай абласной радзільні.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## Помнік Скарыну — у Кішынёве

**Урад Малдовы ўхваліў устаноўку помніка-бюста беларускага першадрукара**

Рашэнне, якое ініцыявала Міністэрства культуры Малдовы, прымеркавана да 500-годдзя выдання першай кнігі на беларускай мове. Плануецца, што помнік з'явіцца ў скверы ў цэнтры сталіцы на скрыжаванні вуліц Аляксея Мацеевіча і Мітрапаліта Гаўрыіла Бэнулеску-Бадоні. Беларуская фінансавыя сродкі і спонсарская дапамога пойдуць на распрацоўку праектнай дакументацыі, устаноўку пастамента і бюста. Сам помнік-бюст першадрукара створаць у Беларусі. Міністэрства культуры Беларусі арганізуе конкурс, дзе выберуць аўтара праекта. Такое рашэнне было прынята ў ходзе 18-га пасяджэння беларуска-малдаўскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, якое праходзіла ў чэрвені ў Мінску.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин №25** | 54,4 кв. м. | 600/С-139863 | Минская обл., Минский р-н, Хатежинский с/с, д. Дубенцы, ул. Центральная, 11А |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке:** пл. **0.0484 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина № 25 (срок действия по 10.07.2037). | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 18 000 руб. 00 коп. (снижена на 10%)** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание магазина №36** | 150 кв. м. | 600/С-155271 | Минская обл., Минский р-н, Шершунский с/с, д. Рогово, ул. Гастелло, 4А |
| Составные части и принадлежности: пристройка, хоз. блок | | | |
| **Сведения о земельном участке:** пл. **0.0771 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №36 (срок действия по 29.09.2043) с установленными ограничениями (зона отдыха "Вязынка"). | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 45 000 руб. 00 коп. (снижена на 10%)** | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Магазин №37** | 37,5 кв.м. | 600/С-139783 | Минская обл., Минский р-н, Роговский с/с, д. Чировичи, 17А |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сведения о земельном участке:** пл. **0.0158 га** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина №36 (срок действия по 18.09.2042) с установленными ограничениями (зона отдыха «Вязынка»). | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 3 600 руб. 00 коп. (снижена на 10%)** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки». | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.** | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи. | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.05.2017 | | | |
| **Аукцион состоится 24.07.2017** в 11ч. 00 мин. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. | | | |
| **Заявления на участие** и **необходимые документы принимаются по 21.07.2017** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. **Email: auction@cpo.by** | | | |


# НАШЫ ЛЕКІ ЗА МЯЖОЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота БЕЛТА.

Штогод Барысаўскі завод выпускае звыш 5 млрд таблетак, 500 млн ін'екцыйных раствораў у ампулах, 185 млн капсул, 50 млн флаконаў антыбіётыкаў у выглядзе стэрыльных парашкоў, 13 млн туб мазяў і геляў, 10 млн флаконаў настоек і спіртавых раствораў. У 2013 годзе была ўведзена ў эксплуатацыю вытворчасць цвёрдых лекавых сродкаў паводле ўсіх патрабаванняў міжнароднага стандарту GMP. У 2015-м адкрыўся цэх стэрыльнай расфасоўкі антыбіётыкаў, таксама спраектаваны і пабудаваны па стандартах GMP. Сёння на прадпрыемстве адбываецца маштабная рэканструкцыя ампульнай вытворчасці з аб'ёмам інвестыцый 22,5 млн долараў і тэрмінам рэалізацыі да канца гэтага года.

Да 2020 года плануецца асвоіць новую лінейку прэпаратаў — спрэі, назальныя лекі, а да 2030-га ёсць намер пабудаваць і запусціць вытворчасць субстанцый, чаго ў Беларусі пакуль наогул няма. Кіраўніцтва завода актыўна шукае для гэтага замежных інвестараў.

90 працэнтаў вытворчых участкаў завода поўнасцю сертыфікаваны, 10 працэнтаў знаходзяцца на рэканструкцыі. Барысаўскі завод з'яўляецца пакуль адзіным у Беларусі і сярод краін СНД, які сертыфікуе сваю вытворчасць на адпаведнасць патрабаванням GMP FDA (упраўленне па кантролі за якасцю харчовых прадуктаў і лекавых прэпаратаў ЗША), што ў выніку дазволіць пастаўляць лекі ў ЗША і на новыя замежныя рынкі.

Самае буйное прыватнае фармпрадпрыемства «Лекфарм» экспартавала летась прадукцыі на 5,6 млн долараў. Яно выпускае ўжо не толькі лекавыя прэпараты ў таблетках, капсулах, парашках, але і ін'екцыі ў ампулах, плануе зарэгістраваць і прыступіць да вытворчасці больш як 40 найменняў лекавых сродкаў. Не так даўно тут быў уведзены ў эксплуатацыю цэх па вытворчасці ін'екцый у ампулах з абсталяваннем вядучых сусветных вытворцаў. Магутнасць вытворчасці — да 150 млн ампул у год. Да канца гэтага года плануецца ўвесці новы цэх па вытворчасці цвёрдых лекавых сродкаў у таблетках, капсулах і парашках паводле міжнароднага стандарту GMP.

— Лінія па выпуску ін'екцыйных раствораў у ампулах — унікальная для нашай краіны, бо мы працуем з закрытымі ампуламі нямецкай кампаніі, што выключае магчымасць трападання ў ампулу іншародных цел, — тлумачыць **начальнік аддзела маркетынгу СТАА «Лекфарм» Інга ШАЛЬКЕВІЧ.** — У стэрыльных умовах ампула распайваецца, туды заліваецца лекавы сродак, і яна зноў запайваецца. З самага пачатку працуем паводле стандартаў GMP — належнай вытворчай практыкі, якая вытрымліваецца ў распрацоўцы, правядзенні іспытаў, рэгістрацыі вытворчасці, кантролі якасці, рэалізацыі лекаў. Гэта дазволіла экспартаваць прадукцыю ў 7 краін, адкрыць прадстаўніцтвы ў Малдове і Казахстане.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

### ■ Прапануецца работа

## 20 міні-кірмашоў вакансій і дзён прадпрыемстваў пройдуць у Мінску ў ліпені

**Наведвальнікі змогуць задаць пытанні патэнцыйным наймальнікам пра ўмовы работы, аплату працы, а аддзелы кадраў раскажуць, якіх спецыялістаў шукаюць. Будзе прадстаўлена інфармацыя аб аплатных грамадскіх работах. Службы занятасці пракансультуюць таксама па прафесійным перанавучанні, рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага, прадастаўленні субсідый для арганізацыі сваёй справы.**

Дні прадпрыемстваў пройдуць на базе аддзелаў працаўладкавання «Маскоўскі, Кастрычніцкі» (11 ліпеня з 10.00 да 12.00), «Першамайскі, Савецкі, Цэнтральны» (11, 18, 25 ліпеня з 11.00 да 13.00) і «Фрунзенскі» (25 ліпеня з 10.00 да 12.00). У іх прымуць удзел РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі, Мінскі гадзіннікавы завод, «Белінтэрпрадукт», «Амкадор-Белвар», «Мінскрамбуд».

Расклад міні-кірмашоў наступны. 13, 20, 27 ліпеня — у аддзеле працаўладкавання «Ленінскі, Партызанскі»; 7, 14, 21, 28 ліпеня — «Фрунзенскі»; 10, 17, 24, 31 ліпеня — «Заводскі»; 11, 18, 25 ліпеня — «Маскоўскі, Кастрычніцкі»; 12, 19, 26 ліпеня — «Першамайскі, Савецкі, Цэнтральны».

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by* ■

### ■ Напярэдадні падзеі

## Балтыйскія гульні пройдуць у Брэсце

**Юнацкі фестываль спорту горад над Бугам будзе прымаць з 7 па 9 ліпеня. У спаборніцтвах паўдзельнічаюць каля 1,5 тысячы спартсменаў з Беларусі, Германіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Швецыі і Эстоніі.**

Спаборніцтвы пройдуць па 16 відах спорту — лёгкая атлетыка, стральба з лука, бокс, веславанне на байдарках і каноэ, веславанне акадэмічнае, футбол, гандбол, валейбол, баскетбол, настольны тэніс, дзюдо, вольная і грэка-рымская барацьба, фехтаванне, плаванне, цяжкая атлетыка. Узрост удзельнікаў Гульняў (у залежнасці ад віда спорту) ад 13 да 17 гадоў.

Адзначым, пачынаючы з 2001 года Балтыйскія юнацкія гульні праводзяцца раз на два гады, яны з'яўляюцца значным стымулам у павышэнні спартыўнага майстэрства рэзерву нацыянальных і зборных камандаў краін-удзельніц Гульняў. Акрамя таго, удзел юных спартсменаў у гэтых міжнародных спаборніцтвах спрыяе ўмацаванню супрацоўніцтва, дружбы і ўзаемаразумення з аднагодкамі еўрапейскіх дзяржаў і краін Балтыйскага рэгіёна, а для многіх спартсменаў Гульні становяцца першым буйным міжнародным спаборніцтвам.

На IX Балтыйскіх юнацкіх спартыўных гульнях 2015 года, якія прайшлі ў Брандэнбургу (Германія), беларускія спартсмены заваявалі 127 медалёў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Крэмль чакае ад сустрэчы Пуціна і Трампа ўстанаўлення рабочага дыялогу



«Гэта першая сустрэча, першае знаёмства двух прэзідэнтаў, і менавіта наладжванне дзелавых кантактаў стане галоўным у маючай адбыцца 7 ліпеня сустрэчы», — лічыць прэс-сакратар кіраўніка расійскай дзяржавы Дзмітрый Пяскоў.

«Мы чакаем таго, каб усталяваўся рабочы дыялог, які, напэўна, жыццёва неабходны для ўсяго свету ў плане павышэння эфектыўнасці вырашэння крытычнай масы канфліктаў, праблем, якая расце з кожным днём», — адзначыў прадстаўнік Крамля. Ён дадаў, што Масква чакае, што сустрэча пройдзе ў рабочай атмасферы.

Пяскоў заўважыў, што Пуцін рыхтуецца да сустрэчы з Трампам «гэтак жа, як і да астатніх сустрэч, якія запланаваны на палях саміту «дваццаткі». Раней паведамлялася, што ў расійскага Прэзідэнта пройдзе серыя двухбаковых сустрэч, у тым ліку з кіраўнікамі Японіі і Паўднёвай Карэі.

## У Санкт-Пецярбургу дэманціравана мемарыяльная дошка Калчаку

Мемарыяльная дошка беламу адміралу Аляксандру Калчаку, якая была ўсталявана ў Санкт-Пецярбургу ў лістападзе 2016 года на доме, дзе ён жыў, дэманціравана. Пра гэта паведаміў ТАСС каардынатар мемарыяльна-асветніцкага і гісторыка-культурнага цэнтра «Белая справа» (ініцыятар устаноўкі мемарыяльнай дошкі) Алег Шаўцоў.

«Дошку дэманціравалі. Нам нічога не сказалі, каб не было пікетаў. Дошка будзе захоўвацца ў музеі манументальнай скульптуры, — сказаў ён. — Мы будзем далей судзіцца».

У студзені Смольнінскі райсуд задаволіў адміністрацыйны іск некалькіх жыхароў горада аб прызнанні незаконнай пастановы ўрада Пецярбурга аб ўсталяванні мемарыяльнай дошкі і абавязаў камітэт па культуры Смольнага дэманціраваць знак, усталяваны на фасадзе дома, дзе ў свой час жыў адмірал Калчак. У іску заяўнікі спасылаліся на тое, што адмірал Калчак да гэтага дня з фармальнага пункту гледжання лічыцца ваенным злачынцам — у 1999 годзе суд Забайкальскай ваеннай акругі прызнаў яго не падлягаючым рэабілітацыі, што пазней пацвердзіў Вярхоўны суд Расійскай Федэрацыі. У камітэце па культуры тады прынялі рашэнне не здымаць дошку да ўступлення рашэння суда ў законную сілу.

У красавіку Санкт-Пецярбургскі гарадскі суд адхіліў скаргу ініцыятараў усталявання мемарыяльнай дошкі Калчаку на рашэнне суда першай інстанцыі аб яе дэмантажы.

## ДТЗ у Аўстрыі: 7 тысяч курэй разбеглася па трасе

Незвычайнае ДТЗ з удзелам курэй здарылася на аўтабане паблізу горада Лінц на поўначы Аўстрыі. Як паведамляюць інфармагенцтвы, у ДТЗ трапіў грузавік, які перавозіў курэй, у выніку чаго 7 тысяч іх разбеглася па дарозе і заблакавала яе.

Кіроўца прызнаўся, што заснуў у дарозе, і грузавік уехаў у апору моста, пасля чаго птушкі і апынуліся на дарозе.

Амаль 120 супрацоўнікаў надзвычайных службаў лавілі на трасе ўцекачоў. Не абышлося без ахвяр: сотні птушак загінулі. У выніку здарэння ўзнік 14-кіламетровы затор.